УДК 947.6

**І. У. Каляда**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# РАСПРАЦОЎКА КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920-Я ГГ.

У артыкуле разглядаюцца пытанні распрацоўкі на Беларусі нацыянальнай палітыкі – беларусізацыі, якая стала вызначальнай рысай усяго грамадскага развіцця БССР 1920-х гг. Для ажыццяўлення гэтай палітыкі існавалі пэўныя перадумовы – ідэі і практыка беларускага нацыянальнага руху, утварэнне беларускай дзяржавы і ўзбуйненне яе тэрыторыі, лібералізацыя эканамічнага жыцця, адступленне ад імкнення фарсіраваць сусветную рэвалюцыю. Характар і змест нацыянальнай палітыкі шмат у чым прадвызначаліся тымі пераменамі, што пачаліся ў краіне ў цэлым. У праграме беларусізацыі ўлічваўся шматнацыянальны склад насельніцтва, яго своеасаблівае рассяленне на тэрыторыі рэспублікі, нізкі ўзровень эканамічнага развіцця краіны, непрапарцыянальна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання. Пры распрацоўцы палітыкі беларусізацыі асаблівая ўвага была звернута на развіццё беларускай мовы, нацыянальнай адукацыі і навукі, культурнае адраджэнне рэспублікі, кадравае пытанне. Не засталіся без увагі інтарэсы тых нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі.

Палітыка беларусізацыі была ўзнята на ўзровень дзяржаўнай з дакладным замацаваннем у адпаведных законах, аказала выключнае ўздзеянне на насельніцтва краіны, дала вялікую надзею на рэалізацыю ідэй нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якія ў другой палове 1920-х гг. знайшлі сваё ўвасабленне на практыцы.

**Ключавыя словы:** нацыянальная палітыка, перадумовы, мова, падрыхтоўка, дзяржава, праграма, насельніцтва, культура, асаблівасці, беларусізацыя.

**Для цытавання:** Каляда І. У. Распрацоўка канцэпцыі нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920-я гг. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 1 (245). С. 58–62.

**I. U. Kolyada**
Belarusian State Technological University

# DEVELOPMENT OF THE NATIONAL CONCEPT POLITICIANS IN BELARUS IN THE 1920s

The article considers the issues of developing a national policy in Belarus – Belarusianization, which became a defining feature of the entire social development of the BSSR in the 1920s. There were certain preconditions for the implementation of this policy – the ideas and practices of the Belarusian national movement, the formation of the Belarusian state and the expansion of its territory, the liberalization of economic life, the retreat from the desire to force the world revolution. The nature and content of national policy was largely determined by the changes that began in the country as a whole. The program of Belarusianization took into account the multinational composition of the population, its peculiar settlement in the country, the low level of economic development of the country, the disproportionately low share of Belarusians in party, Soviet, economic authorities and government. During the development of the policy of Belarusianization, special attention was paid to the development of the Belarusian language, national education and science, the cultural revival of the republic, and the personnel issue. The interests of those national minorities living in Belarus were not ignored.

The policy of Belarusianization was raised to the level of the state with a clear enshrinement in the relevant laws, had an exceptional impact on the population, gave great hope for the implementation of the ideas of national and cultural construction, which in the second half of the 1920s. found their embodiment in practice.

**Key words:** national policy, preconditions, language, training, state, program, population, culture, features, Belarusianization.

**For citation:** Kolyada I. U. Development of the national concept politicians in Belarus in the 1920s. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 58–62 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Беларусізацыя – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг., для паспяховага ажыццяўлення якой існавалі пэўныя духоўныя і сацыяльна-палітычныя перадумовы.

Ідэі і практыка беларусізацыі былі закладзены беларускім нацыянальным рухам, які нараджаўся і развіваўся пад знакам ідэй нацыянальнага адраджэння. Ідэя адраджэння, па сутнасці, уяўляла сабой цэласную нацыяналь-

ную праграму ў палітычнай і культурнай сферах і была звязана з утварэннем незалежнай Беларускай дзяржавы, вяртаннем дзяржаўнага статусу беларускай мове, аднаўленнем культурных, гістарычных традыцый беларускага народа. У выніку ўтварэння Беларускай дзяржавы ў форме БССР, а таксама далейшага яе ўзбуйнення адна з асноватворных ідэй нацыянальнага самавызначэння атрымала практычнае ўвасабленне, што адкрыла шырокія магчымасці для самастойнага развіцця народа.

Адступленне ад імкнення фарсіраваць сусветную рэвалюцыю і лібералізацыя эканамічнага жыцця паклалі пачатак паступоваму перагляду палітыкі ў нацыянальным пытанні. Права нацый на самавызначэнне, абвешчанае «Дэкларацыяй правоў народаў Расіі» (лістапад 1917 г.), стала асновай ідэі федэратыўнага саюзу савецкіх рэспублік. З гэтага часу нацыянальная палітыка РКП(б) набывае новыя рысы, у многім ідзе ад інтарэсаў народаў рэспублік.

Характар і змест нацыянальнай палітыкі шмат у чым прадвызначаліся тымі пераменамі, што пачаліся ў краіне ў цэлым. У сваім агульным змесце яна не была ўласціва толькі БССР, а праводзілася ва ўсіх нацыянальных рэспубліках і рэгіёнах СССР з улікам іх асаблівасцей (палітыка ўкраінізацыі, татарызацыі, цюркізацыі ў Сярэдняй Азіі).

**Асноўная частка.** Беларусізацыя, несумненна, адпавядала нацыянальным імкненням беларускага народа, але ж яе ажыццяўленне не было вынікам мясцовай ініцыятывы, а з'яўлялася часткаю агульнасаюзнай дзяржаўнай палітыкі, якая ў гістарычнай літаратуры атрымала назву нацыянал-нэп і заключалася ў пашырэнні правоў усіх без выключэння народаў і народнасцей СССР.

Асноўныя палажэнні гэтай палітыкі былі распрацаваны на Х (сакавік 1921 г.) і ХІІ (красавік 1923 г.) з'ездах РКП(б), дзе была абгрунтавана ідэя федэратыўнага саюзу рэспублік і вызначаны меры па ліквідацыі фактычнай няроўнасці народаў СССР у галіне эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця.

У рашэннях Х з'езда РКП(б) праблема нацыянальнага і культурнага будаўніцтва разглядалася як частка ўсяго комплексу праблем новай эканамічнай палітыкі, якая была скіравана на рэарганізацыю палітычнага і эканамічнага жыцця Беларусі, што, у сваю чаргу, прывяло б да істотных змен у нацыянальным і культурным жыцці [1, с. 360–369].

Рашэнні ХІІ з'езда РКП(б) па нацыянальным пытанні былі ўжо больш канкрэтызаваны і прадугледжвалі выданне спецыяльных законаў, якія б забяспечвалі ўжыванне роднай мовы ва ўсіх дзяржаўных органах і ўстановах, мерапрыемствы па рэаганізацыі нацыянальных вайсковых часцей, роўнасць правоў ва ўзаемаадносінах цэнтральных і рэспубліканскіх улад і інш. [2, с. 79–87].

Азначаныя рашэнні спрыялі таму, што палітыка беларусізацыі была ўзнята на ўзровень дзяржаўнай з дакладным замацаваннем у адпаведных законах. Асноўныя канцэптуальныя падыходы і накірункі гэтай палітыкі былі вызначаны яшчэ беларускім нацыянальным рухам, і многія з ідэй беларусізацыі ўжо тады пачалі ажыццяўляцца (напрыклад, стварэнне беларускіх школ і адначасова школ для народаў іншых нацыянальнасцей, перавод справаводства на беларускую мову).

Фактычна прынцыпы палітыкі беларусізацыі былі сфармуляваны на VII з'ездзе КП(б)Б (сакавік 1923 г.) у пастанове «Канкрэтызацыя платформы ЦК РКП(б) ва ўмовах БСС Рэспублікі», дзе вызначаўся комплекс мер па гаспадарчым адраджэнні краю, тэрытарыяльным самавызначэнні беларускага народа, развіцці беларускай мовы і нацыянальнай культуры, вылучэнні і выхаванні кадраў партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага, кааператыўнага апаратаў [3, с. 94–102].

Вызначаныя ў пастанове меры па беларусізацыі адкрывалі шырокія магчымасці для ажыццяўлення ідэй беларускага адраджэння з улікам такіх асаблівасцей, як нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва Беларусі, нізкі ўзровень эканамічнага развіцця краіны і інш.

Шматнацыянальны склад насельніцтва, яго своеасаблівае рассяленне на тэрыторыі рэспублікі неабходна было ўлічваць пры рапрацоўцы і ажыццяўленні беларусізацыі. Так, па перапісу 1926 г., пасля другога ўзбуйнення БССР доля беларусаў складала 80,6%, яўрэяў – 8,2, рускіх – 7,7, палякаў – 2, украінцаў – 0,7, латышоў – 0,3, літоўцаў, немцаў, татараў – па 0,1, усіх іншых – 0,2% [4, с. 60]. Улічваць трэба было і тое, што беларусы галоўным чынам пражывалі ў вёсках, яўрэі, у сілу існаваўшай пры царызме рысы аселасці, сканцэнтроўваліся ў мястэчках і гарадах, складаючы часам да 40–60% колькасці іх жыхароў. У гарадах большай часткай пражывалі і рускія, хаця нямала іх было і ў сёлах. Астатнія нацыянальныя меншасці жылі як у гарадах, так і ў вёсках, утвараючы нярэдка даволі кампактныя групы. Такое рассяленне стварала свайго роду нацыянальны разрыў паміж горадам і вёскай, а таксама ўносіла спецыфіку ў моўнае становішча – рускамоўны горад і беларускамоўная вёска.

Правядзенне нацыянальнай палітыкі ўскладнялася яшчэ і тым, што нацыянальныя і сацыяльныя адметнасці ў сілу гістарычных, гаспадарчых і палітычных умоў цесна перапляталіся

паміж сабою. Яўрэі разглядаліся беларускім сялянствам галоўным чынам як насельніцтва ў большай меры гандлёвае, няздольнае да прадукцыйнай працы (хаця значная частка яўрэяў займалася саматужнымі рамёствамі і працавала на фабрыках і заводах у якасці рабочых).

Неабходна адзначыць таксама нізкі эканамічны ўзровень развіцця Беларусі, павялічаны вайной і разрухай, якому спадарожнічаў жабрацкі ўзровень дабрабыту народа. Гаспадарчая адсталасць Беларусі і русіфікатарская палітыка царскага ўрада адбіліся на культурным развіцці беларусаў. Падняць культурны ўзровень жыцця, а тым самым павысіць сацыяльную актыўнасць насельніцтва было адной з асноўных задач нацыянальнай палітыкі.

Ускладняла выпрацоўку і правядзенне нацыянальнай палітыкі і непрапарцыянальна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання. Беларусізацыя пачыналася тады, калі гэтая доля не дасягала і паловы. Назіралася такая з’ява, калі беларусы – большасць насельніцтва рэспублікі – засталіся ў відавочнай меншасці ў партыйным і дзяржаўным апараце. Зразумела, што падобнае становішча не садзейнічала нармальнаму развіццю нацыянальных адносін і мела ў далейшым самыя негатыўныя вынікі.

Такія суадносіны ў кіруючых органах тлумачацца ў першую чаргу тым, што яўрэі і рускія, якія пражывалі ў асноўным у гарадах і мястэчках, нават і да Кастрычніцкай рэвалюцыі мелі больш магчымасцей атрымліваць добрую адукацыю. Невыпадкова самая значная колькасць пісьменных сярод розных нацыянальнасцей на Беларусі была ў яўрэяў – 70%, трохі менш у палякаў і рускіх – 50 і 49 адпаведна, у беларусаў – 36% (па перапісу 1926 г.) [5, с. 60–61].

Пры распрацоўцы палітыкі беларусізацыі на кадравае пытанне была звернута асаблівая ўвага.

Афіцыйны статус дзяржаўнай палітыкі беларусізацыя атрымала з прыняццем на II сесіі ЦВК БССР (ліпень 1924 г.) пастановы «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі» [6, с. 7–9] і рэзалюцыі пленуму ЦК КП(б)Б (ліпень 1924 г.) «Аб праграме работ па правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі» [3, с. 115–120]. Згодна з гэтымі пастановамі раўнапраўнымі на тэрыторыі Беларусі абвяшчаліся беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы.

Да гэтага часу на Беларусі ўжывалася пераважна руская мова. Беларуская мова выконвала мізэрны аб’ём сацыяльных функцый, нягледзячы на тое, што карэннае насельніцтва складала 80%. Для ўжывання яўрэйскай і польскай моў таксама не знаходзілася месца ў грамадскім жыцці, хаця на іх носьбітаў падаў значны працэнт у агульным складзе насельніцтва Беларусі.

Беларуская мова (з прычыны значнай перавагі ў БССР насельніцтва беларускай нацыянальнасці) выбіралася як пераважная для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Разам з тым за кожным грамадзянінам рэспублікі, да якой бы нацыянальнасці ён не належыў, заставалася права карыстацца сваёй роднай мовай у зносінах з арганізацыямі і ўстановамі.

Вызначаліся канкрэтныя тэрміны пераводу справаводства дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і кааператыўных аб’яднанняў на беларускую мову. На працягу аднаго года на беларускую мову павінны былі перайсці СНК, ЦВК, Наркаматы асветы і земляробства. Наркаматы ўнутраных спраў, юстыцыі, сацыяльнага забеспячэння атрымалі двухгадовы тэрмін, камісарыяты аховы здаро’ўя, фінансаў і ваенных спраў – тры гады [6, с. 39–44].

Ад кожнага супрацоўніка савецкіх, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый патрабавалася веданне беларускай і рускай моў, а для некаторых дадаткова яшчэ і веданне яўрэйскай або польскай. Калі гэтыя ўмовы не выконваліся, то асобы, якія прэтэндавалі на адказныя пасады, не маглі быць прыняты на службу ў дзяржаўныя, грамадскія і прафсаюзныя ўстановы.

Замацоўвалася абавязковае вывучэнне беларускай і рускай моў ва ўсіх навучальных установах БССР.

У ліпені 1924 г. была ўтворана спецыяльная Камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі на чале з вядомым дзяржаўным дзеячам Хацкевічам А. І., у руках якой была сканцэнтравана практычна ўся работа па беларусізацыі. Аналагічныя камісіі былі створаны і пры акруговых выканаўчых камітэтах. Пры агітпрапагандзе ЦК КП(б)Б працавалі спецыяльныя бюро прапаганды і агітацыі сярод працоўных яўрэйскай, польскай, латышскай і літоўскай нацыянальнасцей на іх родных мовах.

Самая сур’ёзная ўвага звярталася на культурнае адраджэнне рэспублікі. Пры падаўляючай большасці беларусаў у агульнай колькасці насельніцтва развіццё беларускай нацыянальнай культуры (мовы, літаратуры, школы) адстала ў параўнанні з другімі нацыянальнасцямі. У рашэннях студзеньскага (1925 г.) пленума ЦК КП(б)Б адзначалася, што лозунг, які неабходна прыняць у культурнай працы, – гэта лозунг «беларусізацыі». «Пры раўнапраўі ўсіх нацый, пры абавязковасці з боку ўрада забеспячэння развіцця культуры кожнай з іх, пры прызнанні дзяржаўнымі мовамі чатырох, – пры ўсім гэтым, аднак, справа развіцця мовы, літа-

ратуры, школы, усёй культуры на беларускай мове прызнаецца першай і асноўнай справай» [6, с. 46–47].

Такім чынам, можна казаць пра беларусізацыю ў шырокім сэнсе – як нацыянальную палітыку ў цэлым, так і ў больш вузкім – як нацыянальна-культурнае будаўніцтва.

На працягу 1924–1925 гг. распрацоўка праграмы беларусізацыі ў цэлым была завершана. У далейшым яна неаднаразова ўдакладнялася і дапаўнялася. Але асновы беларусізацыі, яе галоўныя напрамкі былі расрацаваны да 1925 г. Гэта быў першы этап беларусізацыі, які амаль цалкам быў аддадзены ідэалагічнай падрыхтоўцы, тлумачэнню ў шырокіх колах насельніцтва мэт і задач беларусізацыі.

Палітыка беларусізацыі складалася з дзвюх узаемазалежных частак – нацыяналізацыі і карэнізацыі. Першая азначала шырокае развіццё беларускай культуры (школы, ВНУ на беларускай мове, выданне кніг, навукова-даследчая работа па ўсебаковым вывучэнні Беларусі і г. д.), увядзенне беларускай мовы практычна ў кожную галіну грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця (перавод на беларускую мову партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага, кааператыўнага апарата і часцей Чырвонай арміі). Другая – вылучэнне прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу. Адзначым, што такое вылучэнне адбывалася не па нацыянальнай прыкмеце (беларус – не беларус), а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканальным валоданні беларускай і рускай мовамі. Адсюль і назва гэтага накірунку – карэнізацыя, якая тычылася не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Беларусізацыя была падтрымана шырокімі коламі насельніцтва Беларусі. Дзякуючы шырокай тлумачальнай працы, што вялася ў друку, на прадпрыемствах, у людзей з’явілася заканамернае жаданне аддаць свае сілы і энергію адраджэнню роднай краіны. Пашыралася ўсведамленне таго, што беларусы ўступаюць у культурным развіцці суседнім народам толькі з прычыны вялікіх несправядлівасцей гістарычнага лёсу і што ў мінулым яны ні ў чым не адставалі ад суседніх этнасаў.

Галоўнай апорай у гэтым адраджэнні павінна была стаць інтэлігенцыя як найбольш адукаваны і свядомы пласт беларускага народа. І сапраўды, інтэлігенцыя актыўна ўключылася ў вывучэнне духоўнай спадчыны, каб паставіць яе на службу нацыянальна-культурнаму адраджэнню.

Згуртаванню творчых сіл народа садзейнічала амністыя ўсім удзельнікам антысавецкіх нацыянальных фарміраванняў і арганізацый перыяду 1918–1920 гг., якая была аб’яўлена ў ліпені 1923 г.: выхадцам з працоўных слаёў насельніцтва, беларускім палітычным і культурным дзеячам, членам беларускіх нацыянальных урадаў (Вялікай беларускай рады, Найвышэйшай рады і інш.), былым членам БПС-Р, якія не прымалі актыўнага ўдзелу ва ўзброенай барацьбе супраць савецкай улады і заявілі аб лаяльных да яе адносінах [7, л. 9–11].

Гэта пастанова ставіла мэту аб’яднаць раздзеленую па розных палітычных лагерах інтэлігенцыю на стваральную прафесійную працу на карысць свайму народу. Было зразумела, што без вопытных спецыялістаў нельга весці гаворку пра беларускае адраджэнне.

**Заключэнне.** Больш за год ішла ідэалагічная падрыхтоўка да ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі, калі праз газеты і часопісы абгрунтавана і канкрэтна тлумачылася яе неабходнасць. Каб лепей падрыхтаваць рознамоўных людзей да гэтай падзеі, у рускамоўных перыядычных выданнях, якія павінны былі перайсці на беларускую мову, загадзя пачалі друкаваць на ёй матэрыялы, каб людзі паступова авалодвалі родным словам карэннага насельніцтва. Такія дзеянні дазволілі практычна без ускладненняў прыступіць у далейшым да актыўнай рэалізацыі намечанай праграмы.

Не засталіся без увагі інтарэсы тых нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, што стала яшчэ адной характэрнай рысай беларусізацыі. У пастановах і рашэннях адносна гэтай палітыкі іх інтарэсам адводзілася значнае месца. Было разуменне, што поспехі на шляху нацыянальнага адраджэння будуць залежаць ад таго, як успрымуць беларусізацыю іншыя этнічныя супольнасці Беларусі: не можа быць свабоднай і паважанай нацыя, якая сама не паважае правоў іншых народаў, тым больш, калі апошнія з’яўляюцца нацыянальнымі меншасцямі. Адносіны да іх мовы і культуры былі аналагічнымі адносінам да беларускай мовы і культуры. Іх развіццё падтрымлівалася, забяспечвалася матэрыяльна і арганізацыйна. І дзякуючы гэтаму, некарэннае насельніцтва ў аснове сваёй прыхільна ставілася да беларусізацыі і з гэтага боку не назіралася якіх-небудзь сур’ёзных пярэчанняў, супраціўлення такой палітыцы. Больш таго, беларусізацыя 1920-х гг. дала багата прыкладаў плённай працы прадстаўнікоў рускай, польскай, яўрэйскай, украінскай і іншых нацыянальнасцей на ніве беларускай культуры.

Такім чынам, палітыка беларусізацыі, разлічаная на доўгі перыяд і меўшая сваёй мэтай развіццё нацыянальнай культуры, адраджэнне беларускай мовы, стала вызначальнай рысай

усяго грамадскага развіцця БССР 1920-х гг. Яна была добра распрацавана, у яе ажыццяўленні ўдзельнічалі тысячы людзей – партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных дзеячаў, настаўнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Беларусізацыя аказала выключнае ўздзеянне на насельніцтва краіны, дала вялікую надзею на рэалізацыю ідэй нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якія ў другой палове 1920-х гг. знайшлі сваё ўвасабленне на практыцы.

## Спіс літаратуры

1. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М.: Политиздат, 1983. Т. 2. 606 с.

2. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М.: Политиздат, 1984. Т. 3. 510 с.

3. КПБ в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск: Беларусь, 1983. Т. 1. 527 с.

4. Будзін Ш. А. Нацыянальнае пытанне. Менск: Дзяржаўнае выд-ва Беларусі, 1932. 392 с.

5. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню. Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1929. 167 с.

6. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР: у 2 ч. Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР. Ч. 1. 1928. 152 с.

7. НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 703.

## References

1. *KPSS v rezolyutsyyakh i resheniyakh s'eyzdov, konferentsiy i plenumov TsK* [KPSS in resolutions and solutions congresses, conferences and plenums CK]. Moscow, Politizdat Publ., 1983. Vol. 2. 606 p.

2. *KPSS v rezolyutsiyakh i resheniyakh s'eyzdov, konferentsiy i plenumov TsK* [KPSS in resolutions and solutions congresses, conferences and plenums CK]. Mjscow, Politizdat Publ., 1983. Vol. 3. 510 p.

3. *KPB v rezolyutsiyakh i resheniyakh s'eyzdov i plenumov TsK* [KPB in resolutions and solutions congresses and plenums CK]. Minsk, Belarus Publ., 1983. Vol. 1. 527 p.

4. Budzin Sh. A. *Natsyyanal'naye pytanne* [The national question]. Minsk, Dzyarzhaunaye vydavetstva Belarusi Publ., 1932. 392 p.

5. *Dva gady natsyyanal'nay raboty u BSSR: zbor pramou, artykulau i rezalyutsyy pa natsyyanal'namu pytannyu* [Two years of national work in BSSR: the collection of speeches, articles and resolutions on the national question]. Minsk, Vydavetstva Natskamisii TsVK BSSR Publ., 1929. 167 p.

6. *Praktychnaye vyrashenne natsyyanal'naga pytannya u BSSR* [The practical solution of the national question in the Byelorussian SSR]. Minsk, Vydavetstva Natskamisii TsVK BSSR Publ., 1928. 152 p.

7. NARB. Fund 4. I. 1. F.

## Інфармацыя пра аўтара

**Каляда Іна Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koleda@belstu.by

## Information about the author

**Kolyada Ina Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koleda@belstu.by

*Пастуціў 05. 03. 2021*